# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 снежня 2009 г.
№ 42 (194)


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## СТАНДАРТ — ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ДАРАГОЕ,

### або Дэцэнтралізацыя па-баранавіцку

**Сёняшні час патрабуе ад улады найбольш актыўнай работы ва ўсіх кірунках, і ў першую чаргу — у рэалізацыі сацыяльных стандартаў. Такімі словамі распачаў сваё выступленне на адкрыцці рэспубліканскага семінара для старшыняў гарадскіх Саветаў дэпутатаў, прысвечанага рабоце прадстаўнічых і выканаўчых органаў улады па выкананні сацстандартаў, старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Віктар ДЗІЧКОЎСКІ. «Як і ва ўсіх, у нас гэты год быў напружаны, — адзначыў выступоўца, — аднак ён дазваляе нам сёння зрабіць пэўныя высновы, паказвае, што мы яшчэ не дарабілі».**

Адзін з галоўных сацыяльных стандартаў — утрыманне ў парадку вуліц і дарог населеных пунктаў. І для такіх буйных гарадоў, як Баранавічы, гэта сёння сур'ёзная праблема. Для таго, каб выканаць згаданы сацыяльны стандарт, тут патрэбна добраўпарадкаваць больш за 100 км гарадскіх вуліц і дарог. Цана пытання — 200 мільярдаў рублёў, што сувымяральна з 2/3 гадавога бюджэту горада. «Зразумела, гэта наша гарадская, унутраная праблема, — адзначыў Віктар Дзічкоўскі, — аднак яе рашэнне патрабуе ўвагі не гарадской, бо самастойна мы яе вырашыць не зможам. Як бы мы ні перавыконвалі свой бюджэт, але на 200 мільярдаў мы не напрацуем».

Нявырашанай пакуль застаецца і праблема падтаплення шэрагу вуліц і дарог, якія размешчаны на тэрыторыі з высокім узроўнем грунтовых водаў. Ёсць цэлыя вуліцы, дзе перыядычна ў дамах з'яўляецца вада. Паводле слоў мэра, мясцовыя службы прымаюць неабходныя меры. Аднак галоўны стрымальны фактар — тэрытарыяльны (балота, якое з'яўляецца прычынай падтаплення гарадскога жылля, размяшчаецца на тэрыторыі раёна). Гэта канцэптуальнае пытанне. «Я думаю, што для вялікіх гарадоў трэба заканадаўча вызначаць пяцікіламетровую зону ад мяжы горада, якая ў перспектыве будзе адыходзіць гораду і якой трэба кіраваць, абапіраючыся не на добрыя адносіны з раённымі ўладамі, а на заканадаўства, — выказаў прапанову Дзічкоўскі. — У цэлым, у нас з раёнам добрыя стасункі, але неабходна прававое поле, якое будзе рэгуляваць гэтыя ўзаемаадносіны».

Кіраўнік гарвыканкама падзяліўся з прысутнымі вопытам па рэфармаванні сістэмы аховы здароўя ў сваім горадзе. У якасці станоўчага прыкладу прывёў шведскі варыянт арганізацыі медыцынскага абслугоўвання.

— Апошнім часам мы актыўна супрацоўнічаем са шведамі па двух кірунках — ахове здароўя і сацыяльнай працы, — расказаў Віктар Іванавіч. — Нашы дэлегацыі неаднаразова пабывалі ў Швецыі, дасканала азнаёміліся з іх вопытам. Нешта вырашылі ад шведаў пераняць... У нас па сутнасці гарадская паліклініка — гэта 2 мільёны наведванняў у год. Атрымліваецца, што кожны грамадзянін па 10, а некаторыя і па 15 разоў за год прайшлі праз паліклініку. У Швецыі, як і ў нас, медыцына бясплатная, але там ёсць пэўны псіхалагічны бар'ер. Для таго, каб наведаць паліклініку (урача агульнай практыкі), трэба заплаціць 1 еўра. Калі чалавеку не вельмі патрэбна, ён і 1 еўра з кішэні не патраціць. А ў нас паліклініка ператварылася ў клуб, куды прыходзяць пабурчаць наконт чэргаў. Нам часта гавораць, што ў нас не хапае бальніц, што трэба будаваць новыя паліклінікі. Я лічу, што ўсе гэтыя размовы абсалютна беспадстаўныя і не адпавядаюць рэчаіснасці.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

## ВІЗІТНАЯ КАРТКА «ЧУЖОГА» ДОМА

**Я быў прыемна ўражаны, калі, патэлефанаваўшы на нумары 35-1-29, пачуў:**

**— Добры дзень! Бальніца сястрынскага догляду. Вас слухаюць.**

**Голас добразычлівы. Паверце, не кожная ўстанова так паважліва адгукнецца на ваш званок. Гэта і была «візітная картка» Любоніцкай бальніцы сястрынскага догляду.**

Напрыканцы мінулага года ў Любонічах адбылося ўрачыстае адкрыццё аграгарадка. Па-новаму, пасучаснаму сталі выглядаць будынкі сацкультбыту, адміністрацыйныя ўстановы, вытворчыя памяшканні, спартыўныя збудаванні, гандлёвы цэнтр, вуліцы. Сціплая ўстанова аховы здароўя — бальніца сястрынскага догляду — таксама не засталася па-за ўвагай...

Прайшоў год. Гутару з загадчыцай установы Ірынай Бодык. Яна расказвае, што бальніца сястрынскага догляду адчынілася ў Любонічах у 2004 годзе, заняўшы памяшканне былой участковай бальніцы. Будынак аднапавярховы, цагляны. Тады яго абшылі знутры вагонкай, аздобілі цяжкай гіпсавай пліткай (на апошнюю была некалі вялікая мода). Быццам бы і добра. Але час мяняе густы і патрабаванні. І ў мінулым годзе тут правялі капітальны рамонт, зрабілі рэканструкцыю ўнутраных памяшканняў, вынеслі ўсё груваасткае, састарэлае. Цяпер тут светла і прасторна. Цёплая афарбоўка сцен радуе вока. Зараз у бальніцы пражывае-лечыцца 20 чалавек. Людзі ў асноўным сталага веку, але з рознымі лёсамі. Некаторыя з іх перажылі ваеннае ліхалецце, адбудоўвалі разбураную вайной гаспадарку.

— Ірына Рыгораўна, а навошта ўвогуле спатрэбілася бальніца сястрынскага догляду? Ёсць жа амбулаторнае лячэнне, стацыянар, нарэшце, — пытаюся ў загадчыцы.

— Ёсць людзі, якія па стане здароўя не могуць карыстацца актыўнай спецыялізаванай урачэбнай дапамогай і не маюць неабходных умоў для медыцынскага догляду дома. Мы забяспечваем пацыентаў медыка-сацыяльнай дапамогай, якая ўключае медыцынскае назіранне і догляд, комплекс сістэматычнай тэрапіі, фізічнай рэабілітацыі і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку актыўнай жыццядзейнасці.

Перад тым, як ісці ў пакой для пацыентаў, Ірына Рыгораўна папярэджвае:

— Калі ласка. Ніякіх роспытаў пра дзяцей: пачнуцца слёзы, успаміны, папрокі, пасля — глыбокая дэпрэсія, з якой чалавека цяжка вывесці.

У пакоях, зноў жа, светла і ўтульна. Зручныя ложкі, дыхтоўная мэбля, радыё, тэлевізар, халадзільнік, газеты, часопісы, мастацкая літаратура.

Знаёмлюся з Вольгай Максімаўнай Арэшкай, якая да выхаду на пенсію працавала ў калгаснай паляводчай брыгадзе і на жывёлагадоўчай ферме. Увесь час жанчына хадзіла ў гумавых ботах. Таму, мабыць, цяпер «аднімаюцца» ногі. Вольга Максімаўна — чалавек адзінокі і жыццём не распешчаны. За лячэнне і догляд яна вельмі ўдзячная медработнікам.

Аляксандр Дзмітрыевіч Ліпоўскі — інвалід вайны. Жылі ўдваіх з жонкай у вёсцы Скачок. Жонку дачка забрала да сябе ў горад Бабруйск. Кватэра ў яе аднапакаёвая, свая сям'я. Так што нават раскладушку няма дзе паставіць. Уладкавалі Аляксандра Дзмітрыевіча ў бальніцу сястрынскага догляду. Так спакайней — і яму, і сваякам.

Кожныя дзесяць дзён у бальніцу прыходзіць урач мясцовай амбулаторыі Міхаіл Баўтовіч. Робіць агляд, дае кансультацыі. У бальніцы наладжана пяціразовае харчаванне, ёсць ванны пакой і ўцепленыя прыбіральні, пацыенты атрымліваюць бялізну, вопратку, адзенне. Да сценаў тут прымацаваны парэнчы, каб аслабленым людзям было за што трымацца пры хадзьбе... І ўсё ж гэта не ўласны дом. Таму на пачатку многія востра і хваравіта пераносяць «адарванасць» ад родных сценаў.

— Чалавек доўга жыў у адзіноце, замкнёна. І раптам ён адрываецца ад свайго звычнага ладу і трапляе ў калектыў незнаёмых людзей. Для яго гэта ў пэўнай ступені стрэс, — гаворыць Ірына Бодык. — Мы прыглядаемся, вывучаем схільнасці, характар, інтарэсы кожнага, знаёмімся з медыцынскай карткай. У нас ёсць палаты на два, тры і пяць чалавек. Пры размяшчэнні ўлічваем пажаданні пацыентаў, глядзім, каб была псіхалагічная сумяшчальнасць. Адаптацыя праходзіць параўнальна хутка. І ўсё ж адсутнасць псіхолага адчувальная... Пажылыя людзі, выключаныя з актыўнага жыцця, надоўга або назусім адарваныя ад сваёй сядзібы, пакінутыя роднымі і блізкімі, замучаныя хваробамі, нярэдка ўпадаюць у роспач. Мы імкнёмся па меры сваіх магчымасцяў уносіць у жыццё пацыентаў пэўную разнастайнасць, падтрымліваць іх маральна. У добрае надвор'е ходзім на прагулкі (краявіды ў нас цудоўныя), разам глядзім тэлеперадачы, запрашаем сюды святара мясцовай царквы. Хто жадае, мае магчымасць вязаць ці вышываць.

Пасля развалу Саюза, кажа Ірына Рыгораўна, узрасла колькасць адзінокіх старых людзей — іх дзеці і родныя апынуліся за мяжой, кантакты і сувязі з імі парушыліся. Іх нельга пакідаць па-за ўвагай дзяржавы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

...Асабіста я выходзіў з бальніцы з дваякім пачуццём. Так, старых тут кормяць, даглядаюць, яны жывуць у чысціні і цяпле. Але «казённы» дом ніколі не заменіць родны, як ні напружвайся, ні старайся. Ён — гэта хутчэй напамінак нам, маладзейшым, аб тым, як важна берагчы здароўе, будаваць сваё жыццё і адносіны з роднымі і блізкімі так, каб у старасці (а яна непазбежная) мець надзейны прытулак, «запасны аэрадром» — падтрымку і любоў родных і блізкіх...

Будынак бальніцы стаіць у атачэнні магутных векавых соснаў і стромкіх бяроз. У іх галлі трывожна шуміць вецер. Што чуюць насельнікі бальніцы ў гэтым шуме? Водгукі сваёй далёкай маладосці ці самотную мелодыю пра восень жыцця?

**Міхась АЛЕЙНІКАЎ.**

*Кіраўскі раён.*

## ЗАЙМІЦЕСЯ СПРАВАМІ. І ПАЖАДАНА — СВАІМІ

***А*б павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання, аб неабходнасці павялічваць напаўняльнасць першасных бюджэтаў за кошт уласных магчымасцяў, аб скарачэнні папяровага «валу» і «пагалоўнай» камп'ютарызацыі мясцовых органаў улады, а таксама аб адмене некаторых падаткаў і вяртанні «самаабкладання» ішла размова падчас сустрэчы, арганізаванай Інстытутам дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у межах вучобы старшыняў пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў.**

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАМПЕТЭНТНА

## СІЛА ЗАКОНА — У РЭАЛЬНЫХ ДЗЕЯННЯХ УЛАДЫ

**На мінулым тыдні Саветам Рэспублікі быў ухвалены праект новага Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Сваімі меркаваннямі з нагоды гэтых заканадаўчых зрухаў падзяліўся з нашым карэспандэнтам старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Генадзь НАВІЦКІ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***— Генадзь Васільевіч, якія вашы ўражанні ад праекта новага Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні»? У чым яго навізна і адрозненне ад «папярэдніка»?***

— Дзякуючы прыняццю новага закона аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў нашай краіне спрошчана і сістэматызавана заканадаўства па гэтым пытанні. Створана, я лічу, дастаткова поўная і адэкватная сённяшнім рэаліям заканадаўчая база, якая дазволіць органам мясцовага самакіравання функцыянаваць больш эфектыўна.

З прыняццем закона адмяняюцца аж 27 ранейшых заканадаўчых актаў і асобных палажэнняў, якія дзейнічалі яшчэ з 1984 года. Значыць, ужо будзе лягчэй працаваць, бо калі ёсць пад рукамі адзін паўнавартасны дакумент і не трэба корпацца ў іншых — гэта зусім іншая рэч. Упершыню ў законе комплексна ўрэгуляваныя грамадскія адносіны ў галіне мясцовага кіравання і самакіравання, дакладна размежаваныя паўнамоцтвы і адказнасць органаў дзяржаўнай улады і органаў мясцовага самакіравання.

Другі станоўчы момант — і ён відавочны — заключаецца ў тым, што мы зрабілі пэўны рух да збліжэння з аналагічным заканадаўствам еўрапейскіх краін. Дзякуючы новаму закону мясцовыя Саветы атрымалі права аб'ядноўвацца на добраахвотнай аснове ў **асацыяцыі** для вылучэння і далейшага руху рэгіянальных і мясцовых ініцыятыў. Цяпер органы мясцовага самакіравання таксама маюць права здзяйсняць міжнароднае супрацоўніцтва і звяртацца ў суд.

Зменена і структура дзейнага закона: палажэнні, якія рэгулююць пытанні мясцовага самакіравання, змешчаныя ў пачатку, перад палажэннямі аб мясцовым кіраванні. Інакш кажучы, зроблены акцэнт на ролю менавіта мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў мясцовага значэння. Не кажу ўжо пра тое, што ў працэсе падрыхтоўкі тэрміналогія гэтага дакумента была значна адноўленая і прыведзеная ў адпаведнасць з іншымі нормамі грамадзянскага заканадаўства.

Зразумела, я далёкі ад думкі, што мы адказалі абсалютна на ўсе пытанні, якія можа паставіць жыццё. Закон — гэта такі «механізм», які павінен у першую чаргу адпавядаць канстытуцыйнаму полю, рэальным умовам асяроддзя, адказваць на надзённыя пытанні грамадства і крыху працаваць на перспектыву, ствараць перадумовы для руху наперад. Думаю, якраз гэта там ёсць. Новы дакумент дае магчымасць развіваць далей працэс умацавання менавіта мясцовай улады — каб павысіць эфектыўнасць яе працы з насельніцтвам.

Сёння ўсе праблемы, якія могуць быць вырашаныя «ўнізе», на мясцовым узроўні, неабходна там і вырашаць, пра што, дарэчы, неаднойчы гаварыў Прэзідэнт. А для гэтага трэба мець адпаведныя паўнамоцтвы, фінансы і гэтак далей, каб не звяртацца, груба кажучы, па кожнай дзірцы ў агароджы да цэнтральнай улады ці ў Адміністрацыю Прэзідэнта, як гэта было раней. Вось такім патрабаванням і адпавядае новы закон, які дае мясцовым уладам неабходныя паўнамоцтвы. Што будзе далей, як пойдзе працэс умацавання і пашырэння паўнамоцтваў мясцовых органаў улады — пакажа жыццё.

***— Якія пытанні будуць урэгуляваныя дзякуючы новаму закону і як гэта можа паўплываць на сітуацыю на месцах?***

— Распрацоўшчыкі ўлічылі важнасць работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі, таму ў Законе кампетэнцыя органаў мясцовага кіравання і самакіравання дапаўняецца шэрагам адпаведных паўнамоцтваў: заканадаўча замацоўваецца ўкараненне прынцыпу «аднаго акна», спрашчаюцца адміністрацыйныя працэдуры, надаецца ўвага далейшаму ўдасканаленню работы з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі.

Для пашырэння магчымасцяў грамадзянаў у вырашэнні пытанняў мясцовага значэння прадугледжана, што па рашэнні мясцовага сходу ці органа тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання **можа ўводзіцца добраахвотны збор сродкаў грамадзян, або так званае самаабкладанне**. Гэтыя сродкі будуць уключацца ў мясцовы бюджэт і расходавацца толькі на мэты, вызначаныя мясцовым сходам або органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Закон нацэлены таксама на вырашэнне праблем, абазначаных Указам № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва»: правы органаў мясцовага самакіравання пашыраны перш за ўсё ў частцы фінансавага забеспячэння іх дзейнасці, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай і прававой базы.

***— Ці дастатковую заканадаўчую падтрымку, на ваш погляд, атрымаюць органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання?***

— Органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання забяспечваюць прынцып народаўладдзя. Гэта менавіта **самаарганізацыі**, якія аб'ядноўваюць грамадзян на добраахвотнай аснове. У новым законе ўдакладняюцца прававы статус і кампетэнцыя органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання і вызначаюцца іх задачы, у ліку якіх — садзейнічанне рэалізацыі правоў, свабодаў і законных інтарэсаў грамадзян, вывучэнне іх меркаванняў па пытаннях мясцовага значэння і іншыя. Законам спрошчаны парадак стварэння органаў ТГС і ўдакладнены парадак іх рэгістрацыі і ліквідацыі.

Упершыню заканадаўча замацаваны такі аднаасобны орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, як інстытут старастаў. Цяпер, у адпаведнасці з законам, яны — дзейнае звяно паміж насельніцтвам вёскі ці пасёлка і органамі мясцовага кіравання і самакіравання.

***— А па якіх пытаннях было найбольш складана дасягнуць дамоўленасці на этапе падрыхтоўкі і абмеркавання законапраекта?***

— Першапачаткова разглядалася прапанова аб наданні органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання правоў юрыдычнай асобы — з мэтай павышэння іх статусу і пашырэння паўнамоцтваў.

Аднак з улікам таго, што, паводле інфармацыі Саветаў дэпутатаў і выканаўчых камітэтаў, у краіне дзейнічае толькі адзін орган тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, які з'яўляецца юрыдычнай асобай, а таксама маючы на ўвазе складанасці самой працэдуры іх стварэння, было вырашана захаваць тую норму, якая існавала раней. Інакш кажучы, калегійны орган ТГС можа ствараца або ў выглядзе юрыдычнай асобы, або без утварэння такой — у залежнасці ад выбару грамадзян.

Дарэчы, спачатку артыкул аб праве мясцовых Саветаў дэпутатаў на аб'яднанне ў асацыяцыі быў дэкларатыўным. Затым, у працэсе дапрацоўкі праекта закона, ён напоўніўся канкрэтным зместам. Вельмі важным я лічу тое, што ўдалося заканадаўча замацаваць палажэнне аб фінансаванні дзейнасці асацыяцый — за кошт належных ім грашовых сродкаў і іншай маёмасці, у тым ліку атрыманых ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, спонсарскай дапамогі, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

## ЛЁД ТРОНУЛСЯ...

***В нашу редакцию неоднократно обращалась жительница дома № 11 по улице Парниковой (г. Минск) Людмила Бочкарева, а также другие жильцы этого дома. В свое время дом был построен и сдан с грубыми нарушениями, что выявилось в процессе эксплуатации. Сотрудник редакции дважды выезжал на место, по данной теме были опубликованы статьи, а также последующие реагирования на них официальных инстанций, в чьей компетенции находится вышеназванный дом.***

***И вот, кажется, «голос народа» окончательно услышан властями. На днях в «МС» поступило официальное реагирование, которое позволяет надеяться, что все точки над «і» в деле «злосчастного дома на Парниковой» будут наконец-то расставлены.***

«Рассмотрев публикацию «Ремонт выполнен. Но как?» (02.12.09), УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска» сообщает.

В связи с повторными обращениями граждан жилого дома № 11 по ул. Парниковой в различные инстанции по вопросу неудовлетворительного технического состояния ограждающих конструкций дома в Минском горисполкоме 21.10.2009 проведено совещание. На совещание были приглашены заявители с привлечением специалистов УП «Стройнаука», РУП «Институт «Белжилпроект», института микробиологии НАН Беларуси, комитета по труду, занятости и социальной защите населения Мингорисполкома, центра гигиены и эпидемиологии Первомайского района г. Минска. Был рассмотрен вопрос о выработке совместных мер по окончательному разрешению проблем, поднятых заявителями в обращениях. В ходе совещания специалистами соответствующих ведомств по данному факту заявителям даны разъяснения, которые восприняты с пониманием.

По итогам совещания администрацией Первомайского района г. Минска был разработан план мероприятий по выполнению ремонтных работ по жилому дому № 11 по ул. Парниковой.

В сентябре 2009 года специализированной подрядной организацией проведена проверка и прочистка вентиляционных каналов всех квартир в жилом доме № 11 по ул. Парниковой. Завалов и засоров отверстий вентиляционных каналов не обнаружено, система вентиляции в рабочем состоянии. Кроме того, в процессе выполнения плана мероприятий в ноябре 2009 года проведено обследование системы вентиляции жилого дома на предмет наличия перепланировок.

В коридоре квартиры № 68 произведено переклеивание обоев, установлен молдинг на стык линолеума. Произведена замена автоматических выключателей в электрощите, ремонт розеток.

Все ремонтные работы в квартире Бочкаревой Л.Н. согласно смете выполнены.

**И. САВИЦКАЯ, зам. директора УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска».**

ЗАДАННЕ НА ЗАЎТРА

## Грошы самі не прыйдуць...

### Наколькі рэальны бюджэт Гродзеншчыны на наступны год?

**На сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў зацверджаны праект сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту вобласці на 2010 год. Даходы і расходы бюджэту прагназуюцца ў памеры 2715,1 мільярда рублёў, што складае 94,8 працэнта ад бюджэту гэтага года. Пры гэтым улады рэгіёна разлічваюць, што бюджэт будзе бездэфіцытным, а на сацыяльную палітыку сродкаў выдзелена нават больш у параўнанні з 2009-м.**

**Аднак ці будуць гэтыя і іншыя бюджэтныя разлікі падмацаваныя становішчам спраў у рэальным сектары эканомікі? Вось меркаванні некаторых удзельнікаў сесіі абласнога Савета дэпутатаў.**

**Леанід БЯЛЕЙ, сакратар Пастаяннай камісіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў па эканоміцы, бюджэту і фінансах:**

— У мэтах больш эфектыўнага і рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў у абласным бюджэце цэнтралізаваныя рамонт аб'ектаў аховы здароўя і адукацыі, расходы на набыццё школьнай мэблі і аўтобусаў для падвозу вучняў, на лекавыя сродкі, медыцынскае абсталяванне і санітарны аўтатранспарт, выпуск пратэзных вырабаў.

Хочацца асабліва падкрэсліць, што ў бюджэце наступнага года, нягледзячы на складанасці ў эканоміцы, выдзелена больш сродкаў на сацыяльную сферу. Гэта, у прыватнасці, утрыманне ўстаноў сацыяльнай абароны, моладзевая палітыка, сродкі дзяржаўнага фонду садзейнічання занятасці, падтрымка ў забеспячэнні жыллём, дапамога па забеспячэнні інвалідаў тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, адрасная дапамога, летняе аздараўленне. Па нашай вобласці гэта лічба складае 162,4 мільярда рублёў.

Яшчэ адна асаблівасць бюджэту наступнага года ў тым, што прадугледжаны рост зарплаты ў памеры 15 працэнтаў. Усё гэта, безумоўна, магчыма пры ўмове выканання зацверджанага росту аб'ёму вытворчасці ў цэлым па рэспубліцы і ў вобласці. Прагнозныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна на 2010 год, лічыць наша камісія, напружаныя, але рэальныя.

**Віктар КРАЎЧАНКА, старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, транспарце, сувязі і жыллёва-камунальнай гаспадарцы:**

— Пазбегнуць уплыву фінансавага крызісу не ўдалося нікому, у тым ліку і прадпрыемствам нашай вобласці. Мы ўжо сутыкнуліся са спадам вытворчасці ў машынабудаванні на сусветных рынках, рэзкім скарачэннем цэнаў на беларускія экспартныя тавары, асабліва на прадукцыю хімічнай і нафтахімічнай галін, машынабудавання. Прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці на 2010 год рост вытворчасці прамысловай прадукцыі ў супастаўных цэнах запланаваны ў памеры 11,5—13,5 працэнта. І дабіцца нарошчвання такіх аб'ёмаў можна толькі ва ўмовах павышэння эфектыўнасці вытворчасці, якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, укаранення энергазберагальных тэхналогій, скарачэння затрат.

— Мы ўжо навучыліся вырабляць шмат і якасна, — падкрэсліў у гэтай сувязі **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір САЎЧАНКА**. — Аднак не ўмеем прадаваць тавар. Нельга сядзець у кабінеце і чакаць, хто па яго прыедзе.

Сёння ўжо недастаткова 25 суб'ектаў таваралраводнай сеткі прадпрыемстваў Гродзеншчыны, што працуюць у краінах блізкага і далёкага замежжа. Значнае пашырэнне гэтай сеткі будзе найважнейшай задачай 2010 года.

**Іосіф ШЫШКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях і ахове навакольнага асяроддзя:**

— Бясспрэчна, што бюджэтная дапамога значна ўплывае на паказчыкі, якіх дасягнула наша вобласць у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У наступным годзе на фінансаванне расходаў па сельскай гаспадарцы прадугледжана выдзеліць 247,7 мільярда рублёў, ці 108 працэнтаў да ўзроўню гэтага года. Пераважная частка гэтай сумы будзе накіравана на пагашэнне банкаўскіх крэдытаў, атрыманых пад гарантыю аблвыканкама.

Але ёсць і праблемныя моманты, якія хвалююць аграрнікаў. Сярод іх тое, што ў бюджэце няма крыніцы на пагашэнне крэдытаў, атрыманых на набыццё айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі згодна з адпаведнай рэспубліканскай праграмай. Патрабуецца 81 мільярд рублёў. У папярэднія гады на гэтыя мэты накіроўваліся сродкі рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання. Цяпер жа такой крыніцы не існуе.

**Сцяпан АБУХОЎСКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па мандатах, законнасці, мясцовым кіраванні і самакіраванні:**

— Цяпер паўсюдна завяршаецца падрыхтоўка раённых і сельскіх бюджэтаў. Гэта, перш за ўсё, расходы на зарплату, асвятленне населеных пунктаў, знос пустых дамоў і аварыйных дрэў, ачыстка калодзежаў, распрацоўка генеральных планаў жылой забудовы, дзяржакты на зямлю і пашпарты на магілкі, добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Але, як паказала сёлетняя практыка, асноўныя сродкі ад крыніц папаўнення бюджэтаў у пярвічным узроўні паступаюць, як правіла, у канцы года. І таму, у сувязі з недастатковым фінансаваннем большасць сельскіх выканаўчых камітэтаў па-ранейшаму карыстаецца датацыямі вышэйшых органаў.

Па Гродзенскай вобласці ўдзельная вага датацыйных сродкаў у бюджэтах пярвічнага ўзроўню па сельскіх Саветах складае 68,2 працэнта. Але ў Ваўкавыскім раёне ўсе сельскія Саветы бездатацыйныя, у Гродзенскім раёне датацыі складаюць 23,4, у Ашмянскім — 32,9 працэнта. І ў той жа час у сельскіх Саветах Іўеўскага, Лідскага, Навагрудскага раёнаў датацыі складаюць больш за 90, Астравецкага, Слонімскага, Шчучынскага раёнаў — больш за 80 працэнтаў.

Дарэчы, датацыйнасць можа і ўзрасці ў сувязі з адменай на наступны год падатку з продажу (сродкі паступалі ў бюджэты пярвічнага ўзроўню).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 53 (167)

Прамая лінія

# ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

**На пытанні чытачоў адказаў загадчык спецыялізаванага псіхагерыятрычнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксандр ГОЛУБ.**

*(Працяг. Пачатак у нумары за 22 снежня.)*

***☎ — Брагін, Уладзімір Андрэевіч. 52 гады. Мяне цікавіць, як не стаць пацыентам вашага аддзялення? Можа, парэкамендуеце якія прэпараты, антыаксіданты, амінакіслоты?..***

— Рэкамендаваць канкрэтныя прэпараты для шырокай аўдыторыі я не магу. Аднак у цэлым тыя ж антыаксіданты, безумоўна, маюць значэнне ў прафілактыцы і лячэнні вельмі многіх захворванняў, у тым ліку і псіхічных. Што да незаменных амінакіслот, то яны таксама патрэбныя арганізму. Канкрэтныя ж прэпараты можа парэкамендаваць доктар, які вас назірае... Не забывайцеся на ўмераныя фізічныя нагрузкі — вельмі важная частка здаровага ладу жыцця. Гэта можна рэкамендаваць усім. Разумная актыўнасць адназначна паляпшае агульнае самаадчуванне.

**— Плюс, безумоўна, своечасовая дыягностыка, доплераграфія і г.д...**

— Своечасовая дыягностыка, несумненна, патрэбна, калі ёсць сімптомы атэрасклератычнага пашкоджання сасудаў. Пры значным атэрасклерозе, істотным парушэнні функцыі артэрый могуць прапанаваць і аператыўнае лячэнне. Гэта праводзіцца тады, калі сасуды пакутуюць больш як на 50 працэнтаў.

***☎ — Карэліцкі раён, Васіль Іванавіч. 59 гадоў. Апошнім часам жонку рознымі імёнамі называю. Скажыце, аб чым гэта можа сведчыць? Што можна папіць для паляпшэння памяці?***

— Варта звярнуць увагу на тое, што гэта, хутчэй за ўсё, не адзіная прыкмета парушэння памяці. Можа быць, да псіхіятра па месцы жыхарства трэба падысці з жонкай, якая дала б больш поўную карціну адносна вашага стану. Навакольныя заўважаюць больш, чым самі пацыенты. Магчыма, жонку проста кранае менавіта той аспект, які вы назвалі, аднак не выключана, што ёсць і больш паказальныя сімптомы захворвання, якія проста менш кранаюць, менш значныя для вашай жонкі. Хоць забыццё імёнаў уласных — якраз першая прыкмета парушэння памяці.

***☎ — Мінск, Вольга. Майму бацьку 65 гадоў. Гады 3-4 таму мы пачалі заўважаць, што ў яго з'явіліся праблемы з памяццю, ён стаў рассеяным, не можа засяродзіцца. Урач раённай паліклінікі прапісала гліцын, фезам, вінпацэцін — курсамі. Але мы заўважаем, што праблемы з памяццю прагрэсуюць. Бацьку складана прыгадаць імёны людзей, з якімі ён даўно не бачыўся, ён губляецца ў незнаёмых месцах, яму цяжка знайсці дарогу дадому, калі ён за рулём, асабліва ў цёмны час сутак. Скажыце, калі ласка, чым яму можна дапамагчы?***

— Верагодна, захворванне будзе прагрэсаваць. Перш-наперш вашага бацьку нельга пускаць за руль. З іншага боку, нельга цалкам абмяжоўваць дзейнасць такога чалавека. Калі ён дрэнна арыентуецца ў нязвыклых абставінах, можна западозрыць зараджэнне стану, які прывядзе ў далейшым да дэменцыі — зніжэння інтэлекту. Звярніцеся, калі ласка, з вашым пытаннем да псіхіятра па месцы жыхарства або ў абласны псіханеўралагічны дыспансэр для абследавання і падбору лячэння.

***— Вы сказалі пра разгубленасць у незвычайных абставінах. А калі чалавек губляецца ў звычайных?***

— Гэта ў любым выпадку сведчыць аб сімптомах псіхічнага расстройства. Першая стадыя дэменцыі вызначаецца тым, што пацыент у вельмі знаёмых абставінах яшчэ выконвае нейкія даручэнні, а пры ўскладненні сітуацыі губляецца, не можа ацаніць сітуацыю.

***— А лекі, якія яму прызначылі, могуць дапамагчы?***

— Яны закліканы паляпшаць абмен рэчываў у нервовых клетках. Эфект ад іх павінен быць. Але яны прымаюцца курсамі, і таму можна абмеркаваць з урачом прымяненне яшчэ якога-небудзь паралельнага курсу. Трэба мець на ўвазе, што нягледзячы на прыём медыкаментаў, сімптаматыка будзе прагрэсаваць.

***☎ — Смаргонь, Валерыя. Некалі чытала, што ў аснове дэменцый ляжыць сасудзістая паталогія галаўнога мозга. Ці заўсёды апошняе пагражае развіццём у будучыні дэменцыі? І наадварот, ці заўсёды ў падмурку дэменцыі ляжыць парушэнне работы сасудаў мозга?***

— Да дэменцыі прыводзіць шмат захворванняў, у тым ліку звязаныя з захворваннем сасудаў галаўнога мозга. Але могуць прывесці хвароба Альцгеймера, хвароба Піка, авітаміноз, алкагольная ці іншая інтаксікацыя і г.д. Што да атэрасклерозу, то ён не заўсёды прыводзіць да дэменцыі. Ёсць такі важны момант, як хуткасць нарастання атэрасклерозу. Калі працэс імклівы, то ёсць рызыка, што з цягам часу разаўецца зніжэнне інтэлекту. Дэменцыі, звязаныя з гіпертаніяй, сасудамі часта абумоўлены інсультам ці некалькімі інсультамі. Чым іх больш, тым вышэйшая верагоднасць змянення ў псіхічнай галіне, зніжэння псіхічных функцый, развіцця дэменцыі.

***☎ — Віцебск, Ірына. Маці 66 гадоў. Год таму яна перанесла інсульт. Невялікая рассеянасць, забыццё нейкіх дробязяў назіраліся ў яе і раней. Ці азначае гэта, што ў будучыні яе чакае значнае пагаршэнне памяці? Як палепшыць работу галаўнога мозга?***

— Калі інсульт перанесены, варта выбраць лячэнне сасудзістымі прэпаратамі, каб папярэдзіць далейшае развіццё інсультаў. Гэта ў пэўнай ступені абароніць ад прагрэсавання хваробы.

***☎ — Мінская вобласць, Аляксандра. У бацькі дыягназ «алкагалізм». У яго ўжо было ўскладненне — галюцынацыі, белая гарачка, як кажуць у народзе. Урачы паставілі яго на ногі, але потым зноў пачынаў піць, прычым яшчэ больш, чым да галюцынацый. Зразумела, яму трэба кінуць піць. Але гэта нерэальна. Падкажыце, што ў такіх выпадках рабіць блізкім, да чаго рыхтавацца?***

— Прагноз не надта спрыяльны, паколькі калі пацыент будзе па-ранейшаму ўжываць алкаголь, то будуць прагрэсаваць псіхічныя парушэнні. Гэта можа прывесці да значнага зніжэння памяці, інтэлекту. Імкніцеся як мага больш абмяжоўваць ужыванне спіртнога. Можна правесці лячэнне паўторна, не чакаць развіцця псіхічных расстройстваў.

***— А белыя гарачкі паўтараюцца?***

— Так. Калі пасля зняцця абстынентнага сіндрому пацыент зноў пачынае піць, то ніхто не дасць гарантый адносна таго, што не разаўецца чарговае псіхічнае расстройства, тая ж белая гарачка. На пэўным этапе, калі пачынае нарастаць зніжэнне інтэлекту, спіртное можа перастаць быць актуальным. Пацыента не толькі не будуць хваляваць навакольныя падзеі, але ён проста стане цалкам бездапаможным. Тады будзе і не да алкаголю. Так раней было важна пайсці на піўную, а аднойчы фізічная актыўнасць страціцца. Гэта будзе другі бок праблемы, звязанай з алкагольнай залежнасцю.

***☎ — Слуцк, Кацярына Генадзьеўна. Па якой прычыне зніжэнне інтэлекту можа з'явіцца не ў старэчым узросце, а крыху раней?***

— Усё залежыць ад наяўнасці пэўных захворванняў. Да 60 гадоў ад дэменцый пакутуе дзесьці 1 працэнт насельніцтва, да 70 — каля 5, да 80 — каля 20. Гэта прыблізныя лічбы, бо не ўсе такія пацыенты звяртаюцца да ўрачоў. Праявы стану могуць быць рознай ступені цяжкасці. І калі яны не суправаджаюцца псіхічнымі расстройствамі, а проста характарызуюцца зніжэннем памяці, разумення, інтэлекту ва ўмеранай ступені, то пацыент можа адаптавацца, асабліва калі працэс ідзе павольна і калі ёсць каму прыглядаць. Праблемы ж пачынаюцца, калі дэменцыя суправаджаецца псіхічным расстройствам, галюцынацыямі, трызненнем, дэпрэсіяй. Тады гэта патрабуе кансультацыі спецыяліста.

Часцей за ўсё дэменцыі, якія ўзнікаюць да 60 гадоў, звязаны з алкагольнай інтаксікацыяй, траўмамі і некаторымі захворваннямі — той жа хваробай Альцгеймера, якая можа пачацца і ў 45 гадоў, хоць гэта надта рэдка, паколькі хвароба ўсё ж такі ўласцівая больш сталаму ўзросту.

**— Наколькі мне вядома, па бацькоўскай лініі у нас мела месца такое захворванне, як хвароба Альцгеймера. Раскажыце пра гэту хваробу.**

— Размова ідзе пра дэгенератыўнае захворванне нервовай сістэмы. З'яўляецца яно ў выглядзе сімптомаў, якія адлюстроўваюць функцыю нервовай сістэмы і псіхічнай дзейнасці. Захворванне прагрэсуе і прыводзіць да парушэння ўсіх псіхічных функцый, перш за ўсё інтэлекту і памяці, дэзарыентацыі ў месцы і часе. Парушаецца магчымасць планавання, ліку, чытання, распазнавання навакольных прадметаў. Гэта значна парушае адаптацыю чалавека ў паўсядзённым жыцці.

***— А што можа перашкодзіць перадачы гэтага захворвання ў спадчыну?***

— Ёсць звесткі пра тое, што парушэнні ў 19-й і 21-й храмасомах прыводзяць да такога захворвання. Тым не менш гаварыць аб стапрацэнтным атрыманні ў спадчыну хваробы няма сэнсу. Заўсёды ёсць верагоднасць, што захворванне не ўзнікне.

***— А не вядома, што гэтаму можа паспрыяць?***

— Тут трэба мець на ўвазе, што вялікую ролю адыгрывае працягласць жыцця. Некалі яна была меншай, і такія хваробы былі неактуальнымі.

***— Можна дзе-небудзь дыягнаставаць наяўнасць парушэння ў названых храмасомах?***

— У некаторых выпадках праводзіцца даследаванне бэта-амілаіду ў спіннамазгавой вадкасці ў Германіі або аналіз на спецыфічную актыўнасць некаторых генаў у асобаў пажылога ўзросту ў ЗША. У нашай краіне дыягностыка праводзіцца па сімптомах хваробы, псіхалагічным даследаванні, з дапамогай электраэнцэфалаграфіі і магніта-рэзананснай тамаграфіі галаўнога мозга.

**Святлана БАРЫСЕНКА,**
**Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

## НА ЁЛКАХ У ШКОЛАХ — ТОЛЬКІ СЕРТЫФІКАВАНЫЯ ГІРЛЯНДЫ

Пры правядзенні ва ўстановах адукацыі святочных навагодніх мерапрыемстваў прымяненне саматробных электрычных прыстасаванняў, адкрытага агню, феерверкаў, запалак і запальнічак, піратэхнічных вырабаў, лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў цалкам выключаецца. **Для ілюмінацыйнага ўпрыгажэння ёлкі і памяшканняў дапускаюцца толькі сертыфікаваныя і спраўныя электрычныя гірлянды магутнасцю не больш як 24 Вт.** Такія патрабаванні ўтрымліваюцца ў загадзе «Аб мерах па забеспячэнні бяспекі дзяцей і навучэнскай моладзі пры правядзенні навагодніх мерапрыемстваў», які падпісаў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў.

Забараняюцца таксама пажаранебяспечныя работы ў будынках за 2 дні да правядзення запланаваных навагодніх мерапрыемстваў. Згодна з загадам, будынкі, дзе будуць праходзіць навагоднія мерапрыемствы, павінны быць абследаваны загадзя, перад пачаткам мерапрыемстваў павінны быць правераны ўсе памяшканні, шляхі для эвакуацыі і запасныя выхады. Сродкі пажаратушэння і пажарная аўтаматыка павінны знаходзіцца ў спраўным стане. На кіраўнікоў упраўленняў і аддзелаў адукацыі ўскладаецца задача сумесна з праваахоўнымі органамі забяспечыць грамадскі парадак і бяспеку ўдзельнікаў усіх навагодніх мерапрыемстваў у месцах іх правядзення. Не дапускаецца знаходжанне школьнікаў, студэнтаў і навучэнцаў на свяце без пастаяннага назірання з боку педагагічных работнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## КАВА І ЧАЙ ЗНІЖАЮЦЬ РЫЗЫКУ РАЗВІЦЦЯ ДЫЯБЕТУ



**Аўстралійскія вучоныя пацвердзілі, што ўжыванне кавы і чаю зніжае рызыку развіцця цукровага дыябету.**

Правеўшы метааналіз 18 даследаванняў, праведзеных з 1966 па 2009 год з удзелам 457 922 добраахвотнікаў, вучоныя з Інстытута міжнароднага здароўя Джорджа пераканаліся, што ў людзей, якія выпіваюць ад трох да чатырох кубкаў кавы ў дзень, рызыка захварэць на цукровы дыябет 2-га тыпу на чвэрць меншая, чым у тых, хто выпівае два кубкі і менш. Чай і кава з паніжаным утрыманнем кафеіну валодаюць падобным дзеяннем. Вынікі метааналізу сведчаць пра тое, што супрацьдыябетычны эфект вывучаных напояў звязаны не з кафеінам, які ўтрымліваецца ў іх, як меркавалася раней, а з іншымі рэчывамі, такімі, як магній, лігнаны, катэхіны і іншыя. Аднак, рэкамендаваць ужыванне вялікай колькасці кавы для прафілактыкі дыябету на падставе звестак, што маюцца, не варта, аднак вывучэнне актыўных субстанцый напояў можа прывесці да стварэння прынцыпова новых лекаў ад гэтай хваробы.



# КЛЮЕ!

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

Доктар адкажа

**Да канца года дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**28 снежня** — галоўны ўрач Рэспубліканскай дзіцячай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Галіна Мікалаеўна РАДЗІВОНАВА.

**29 снежня** — галоўны ўрач Мінскага абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

**30 снежня** — галоўны рэабілітолаг— эксперт аддзела медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Уладзімір Валянцінавіч ЛАМАКА.

**31 снежня** — вядучы спецыяліст сектара па рабоце са зваротамі грамадзян Міністэрства аховы здароўя Валерый Аляксеевіч КРАЙНІ.

*У графіку магчымыя змяненні.*



Фота Васіля ЗЯНЬКО

## РАЗВАЖАЦЬ УСЛЫХ КАРЫСНА

**Іспанскія вучоныя даказалі, што разважанні ўслых дапамагаюць больш паспяхова рашаць пастаўленыя задачы.**

У рамках даследавання вучоных цікавіла навуковая дзейнасць старшакурснікаў. Удзельнікі эксперыменту былі ізаляваныя адзін ад аднаго, а іх паводзіны запісваліся на відэакамеру. У час даследавання вучоныя прасілі добраахвотнікаў рашаць задачы спачатку моўчкі, а пасля разважаючы ўслых. У выніку ўдалося высветліць, што, разважаючы ўслых, добраахвотнікі не толькі рашалі хутчэй, але і спраўляліся з больш складанымі заданнямі. Акрамя таго, дадатковы рост эфектыўнасці назіраўся, калі студэнтам дазвалялі карыстацца графічным прадстаўленнем інфармацыі. Даследчыкі спадзяюцца, што іх вынікі дапамогуць у стварэнні эфектыўных механізмаў мыслення і рашэння канкрэтных прыкладных задач. У прыватнасці, вучоныя падкрэсліваюць, што прадстаўленне задач у зручным выглядзе (графічным і гукавым, у дадзеным выпадку) з'яўляецца ключавым фактарам яе рашэння.

# ГРЫП ВЕРНЕЦЦА Ў СТУДЗЕНІ—САКАВІКУ?

## Беларусы супакоіліся, а ўкраінцы зноў грыпуюць?

**ПРАГНОЗЫ наконт прыходу ў Беларусь другой хвалі грыпу пастаянна ўдакладняюцца, і калі раней медыкі схіляліся да думкі, што чарговая хваля грыпу можа «накрыць» беларусаў бліжэй да канца снежня, то цяпер у галоўным медыцынскім ведамстве лічаць, што чарговы эпідпад'ём ВРВІ і грыпу, хутчэй за ўсё, распачнецца ў звычайныя для Беларусі тэрміны. А самы «грыпозны» час для беларусаў — канец студзеня—сакавік.**

Прагнозы наконт інтэнсіўнасці новай эпідэміі выказваюцца таксама вельмі асцярожна: маўляў, паколькі большасць беларусаў яшчэ не сутыкалася з пандэмічным вірусам A/H1N1, то і імунітэт у насельніцтва яшчэ не выпрацаваны. Дарэчы, у Еўропе да 99 працэнтаў у структуры захваральнасці на грып прыпадае на вірус A/H1N1, а ў Расіі — 30 працэнтаў. Па Беларусі такая лічба ўвогуле не прыводзіцца. Галоўны аргумент — адсутнасць неабходнасці ў падліку колькасці індывідуальных выпадкаў захворвання. Як паведамляецца на сайце РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, «такі падлік не мае важнага значэння для маніторынгу як узроўню, так і характару рызыкі з боку пандэмічнага вірусу, а таксама для прыняцця найбольш эфектыўных мераў». Вядома толькі, што па звестках лабараторнага аналізу сярод вірусаў, якія цыркулююць на нашай тэрыторыі, вірусы грыпу А выяўляюцца ў 31,7 працэнта ўзораў біялагічнага матэрыялу.

На гэты момант эпідсітуацыя з прастуднымі захворваннямі, якая складваецца ў Беларусі, не выклікае ў медыкаў трывогі. Затое ва Украіне захваральнасць зноў пачала расці практычна ва ўсіх рэгіёнах, акрамя заходніх яе абласцей, адкуль у мінулы раз і пачала распаўсюджвацца эпідэмія свіногa грыпу. Эпідэмічны парог захваральнасці на грып і ВРВІ перавышаны там у 11 абласцях, а таксама ў Крыме і ў Севастопалі. На парозе эпідэміі знаходзіцца і Кіеў. Рост паказчыкаў захваральнасці адбываецца пераважна за кошт павелічэння колькасці хворых дзяцей школьнага ўзросту. Лабараторна ва Украіне пандэмічны грып быў пацверджаны ў 466 захварэлых, у тым ліку ў 202 хворых, якія памерлі. Высокая актыўнасць віруса пандэмічнага грыпу назіраецца таксама ў Літве, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Нарвегіі, Польшчы, Сербіі, Славеніі, Турцыі, Швейцарыі, Швецыі.

Тым часам з Кітая прыйшло паведамленне аб стварэнні новага лякарства, прызначанага для лячэння і прафілактыкі грыпу A/H1N1 на аснове кампанентаў традыцыйнай кітайскай медыцыны. Лякарства ўвабрала ў сабе як дасягненні кітайскай фармацэўтыкі, так і заходні тэхналагічны досвед. Новы прэпарат, назва якога ў перакладзе з кітайскай мовы гучыць як «Залатая кветка, што лечыць грып», ужо прайшоў клінічныя выпрабаванні і павінен паступіць у продаж у пачатку 2010 года па цане 80 юаняў, або 11,7 долара ЗША. У Кітаі толькі за адзін тыдзень, з 7 па 13 снежня, ад новага грыпу загінулі 116 чалавек.

У Беларусі, як запэўніваюць у галоўным медыцынскім ведамстве, сітуацыя з лекавым забеспячэннем знаходзіцца пад пастаянным кантролем, а запасы найважнейшых антыбіётыкаў і супрацьвірусных сродкаў на аптэчных складах і ва ўстановах аховы здароўя забяспечваюць надзённыя патрэбы. Праўда, у Міністэрстве аховы здароўя не хаваюць сваёй заклапочанасці павелічэннем скаргаў ад насельніцтва на рост цэнаў у аптэках на супрацьвірусныя сродкі ў перыяд пад'ёму захваральнасці на вірусныя інфекцыі, хоць вытворцы цэнаў на сваю прадукцыю не павышалі. Выходзіць, што аптэкі прымянялі максімальныя гандлёвыя надбаўкі на суперзапатрабаваныя супрацьвірусныя сродкі (арпетол, рэмантадзін і іншыя). Таму кіраўнікам РУП «Белфармацыя», «Мінская Фармацыя», «Фармацыя» і суб'ектам гаспадарання ўсіх формаў уласнасці, якія маюць ліцэнзію на фармацэўтычную дзейнасць, прапанавана прыняць дзейсныя меры па непрымяненні максімальных гандлёвых надбавак на названую групу лекавых сродкаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Дзіцячая тэма

# СТАМАТЫТ — ГЭТА СУР'ЁЗНА

**КАЛІ дзіця адмаўляецца ад ежы, у яго павышаецца тэмпература і непрыемна пахне з рота, дыягназ амаль адназначны — стаматыт.**

Каб развеяць сумненні, зазірніце малому ў рот: калі вы ўбачыце на дзяснах і ўнутранай паверхні шчок дробныя бялёсыя пухіркі або брудна-жаўтаватыя язвачкі, акружаныя ярка-чырвоным беражком, значыць, вашы падазрэнні апраўдаліся.

Як жа ўзнікае стаматыт? Нягледзячы на тое, што механізм развіцця хваробы да канца не зразумелы, даўно заўважана, што стаматытам часцей за ўсё заражаюцца слабенькія, з дрэнным апетытам дзеці, якія часта хварэюць. Таму галоўная прычына хваробы хаваецца ў парушэнні работы імуннай сістэмы. Лічыцца, што стаматыт узнікае ў тых выпадках, калі, па нявызначаных пакуль прычынах, імунная сістэма чалавека рэагуе на з'яўленне чужародных малекул, якія яна не можа распазнаць. З'яўленне такіх малекул правакуе атаку лімфацытаў, і гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да ўзнікнення на слізістай язвачак. Пры стаматыце павялічваюцца шыйныя і пад'язычныя лімфатычныя залозкі, а агульны стан малога пагаршаецца, як пры ВРВІ або грыпе. Карацей кажучы, стаматыт — сур'ёзнае захворванне, якое патрабуе неадкладнага, паслядоўнага і даволі працяглага лячэння.

### ЯКІМ БЫВАЕ СТАМАТЫТ?

Часцей за ўсё дзяцей паражае вірусны стаматыт. Яго ўзбуджальнік — вірус герпесу. Заразіцца герпетычным стаматытам можна паветрана-кропельным шляхам або праз агульны посуд, сурвэтку, насоўку. Каварства гэтага віруса заключаецца ў тым, што, раз трапіўшы ў арганізм, ён застаецца там назаўсёды, падчас не выяўляючы сваёй прысутнасці ніякімі сімптомамі. Носьбітамі віруса герпесу, самі таго не падазраючы, з'яўляюцца многія дарослыя. Акрамя таго, пры вірусным стаматыце бывае інкубацыйны перыяд, ад 2 да 21 дня, калі ніякіх сімптомаў захворвання няма, але хворы ўжо заразны для навакольных. Асабліва схільныя да віруснага стаматыту малыя ва ўзросце да трох гадоў.

Бактэрыяльны стаматыт — гэта хвароба брудных рук. У поласць рота штодзень трапляе мноства бактэрый, у тым ліку і тых, якія здольныя выклікаць стаматыт. Звычайна яны нейтралізуюцца слінай, а слізістая абалонка не дае ім пранікнуць у арганізм. Але калі па тых ці іншых прычынах парушаны ўзровень кіслотнасці сліны (напрыклад, у выніку злоўжывання ласункамі або газаванымі напоямі), а на слізістай ёсць якія-небудзь пашкоджанні (невялікі апёк, ранка, незапламбаваны зуб), хваробатворныя бактэрыі не сустракаюць належнага адпору і пачынаюць актыўна размнажацца, выклікаючы стаматыт. Здараецца і так, што бактэрыі атакуюць запаленую слізістую малога, які ўжо захварэў на вірусны стаматыт, і выклікаюць паўторнае заражэнне.

У грудным узросце, часцей за ўсё ў неданошаных немаўлят, сустракаецца малочніца, або грыбковы стаматыт. Выклікае малочніцу грыбок «candida», які нярэдка перадаецца ад хворай маці. Ён можа таксама з'явіцца ў дзяцей пасля цяжкіх інфекцыйных, хранічных захворванняў з прымяненнем антыбіётыкаў у лячэнні. Пры гэтай разнавіднасці стаматыту на языку і слізістай рота малога відаць белы налёт, які нагадвае абрызглае малако.

### ЯК ДАПАМАГЧЫ МАЛОМУ

На жаль, бацькі рэдка ўсведамляюць сур'ёзнасць становішча, лічачы, што з «балячкамі ў роце» яны лёгка справяцца і самі, хатнімі сродкамі. Аднак гэта не так. Стаматыт — захворванне зусім не бяскрыўднае, яно можа мець цяжкія формы і ўскладненні. Нярэдка пераходзіць у хранічную форму, і тады кожная прастуда або ВРВІ заканчваецца абвастрэннем. Таму пры першых жа сімптомах захворвання пакажыце малога стаматолагу або выклікайце ўчастковага педыятра, які прызначыць неабходнае лячэнне. Як правіла, яно ўключае ў сябе прэпараты інтэрферону, які павышае агульны імунітэт, і мазі на аснове ацыклавіру, якія нейтралізуюць вірус герпесу. Дзецям прызначаюць таксама вітаміны і антыгістамінныя сродкі, каб зняць сверб і ацёк. Але ні ў якім выпадку не купляйце прэпараты самі, што называецца «на вока»: тое, што дапамагло іншаму дзіцяці, вашаму можа нанесці шкоду і толькі ўскладніць хваробу!

І яшчэ: няма таго лякарства, якое хутка і без праблем вылечыла б стаматыт. Таму медыкаментозныя прэпараты павінны спалучацца з мноствам іншых працэдур.

Самы галоўны сродак барацьбы з гэтай хваробай — паласканне. Паласкаць рот, асабліва ў першыя дні, трэба як мага часцей, кожныя 2—3 гадзіны. Для паласкання лепш за ўсё выкарыстоўваць адвары траў: календулы, шалфею, рамонку, эўкаліпту, кары дуба. Калі дзіця яшчэ не ўмее паласкаць рот, нахіліце яго галоўку над ваннай і асцярожна арашайце рот пры дапамозе гумавай спрынцоўкі. Не ўводзьце вадкасць вельмі хутка: малое можа папярхнуцца.

Пасля паласкання слізістую рота трэба змазаць алейным растворам вітаміну А, алеем шыпшыны або абляпіхі, сокам каланхоэ. Мазі і алейныя растворы наносяць ваткай, наматанай на драўляную палачку. Выкарыстаныя ваткі адразу ж выкідвайце!

Калі вусны дзіцяці пакрытыя сухімі лускавінкамі, то перад тым, як нанесці мазь, іх трэба адмачыць і зняць. Для гэтага выкарыстайце алейныя растворы або раствор перманганату калію, прыкладваючы змочаную ў іх вату да вуснаў. Пасля змазвання дзіця на працягу гадзіны не павінна есці і піць.

### ЕЖА І ПІТВО

Пры стаматыце дзеці, як правіла, катэгарычна адмаўляюцца ад ежы: бо любое дакрананне да запаленай слізістай выклікае нясцерпныя пакуты. Акрамя таго, адбіваецца і інтаксікацыя пашкоджанага вірусам арганізма. У першыя, асабліва вострыя дні хваробы не варта настойваць. Голад садзейнічае больш хуткаму выздараўленню.

Але частае піццё хвораму дзіцяці неабходнае: з-за запалення слізістай рэзка павялічваецца слінааддзяленне, і хворы страчвае шмат вадкасці. Калі з-за болю і ацёку малому цяжка піць з кубка, прапануйце яму саломінку.

І пітво, і ежа павінны быць камфортнай тэмпературы, цёплыя. Вельмі халодныя або, наадварот, гарачыя стравы яшчэ больш траўмуюць раздражнёную слізістую. Па гэтай жа прычыне нельга даваць салёнае, кіслае, вострае. Салодкае таксама трэба выключыць, бо лішак вугляводаў садзейнічае актыўнаму размнажэнню бактэрый у поласці рота. Самае карыснае пітво — адвар шыпшыны, свежавыціснуты разведзены маркоўны сок, кісель з журавін, чорных парэчак або маліны.

Калі дзіця прагаладаецца, можна даваць яму працёртую вараную агародніну, печаныя яблыкі, кашы на вадзе, тварог, ёгурты. Уся ежа павінна быць паўвадкай, як для немаўляці. На час хваробы мясныя прадукты лепш выключыць з рацыёну. Перад ядой змажце малому рот абязбольвальным сродкам, інакш яно проста не зможа есці. Пасля яды прыгатуйце паласканне з узбітага бялку (1 бялок на паўлітра вады). Затым змажце рот лекавым алеем або маззю. Карміць хворае дзіця трэба 3—4 разы на дзень і нічога не даваць у прамежках паміж ядой. Такія перапынкі патрэбныя для таго, каб лекавыя рэчывы паступілі ў кроў і каб не траўмавалася слізістая поласць рота.

### ТЭХНІКА БЯСПЕКІ

*Стаматыт вельмі заразны, таму абавязкова захоўвайце правілы гігіены.*

- Ізалюйце хворае дзіця ад іншых членаў сям'і.
- Выдзеліце дзіцяці асобны посуд і ручнік. Яшчэ лепш выкарыстоўваць падчас хваробы аднаразовы посуд і ручнік. У гэтым выпадку іх неабходна выкідваць адразу пасля ўжытку.
- Пакой, дзе знаходзіцца хворае дзіця, варта часцей праветрываць і рабіць штодзень вільготную ўборку.
- Даглядаючы хворага, закрывайце рот і нос маскай. Старанна мыйце пасля гэтага рукі і твар. Пажадана час ад часу паласкаць рот настоем траў з дэзынфекцыйным эфектам.



- Пасля выздараўлення малога замяніце яму зубную шчотку.

### ЦІ МОЖНА ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД СТАМАТЫТУ?

*Безумоўна, ад віруса на сто працэнтаў не застрахаваны ніхто. Але ўсё ж існуюць элементарныя спосабы звесці рызыку заражэння да мінімуму.*

- Умацоўвайце імунітэт малога: памятайце, што вірус герпесу пашкоджвае ў першую чаргу аслабленых дзяцей.
- Сачыце за харчаваннем. Стаматыт можа быць справакаваны дэфіцытам вітамінаў групы В, цынку, фоліевай кіслаты, жалеза, селену.
- Бываюць выпадкі, калі стаматыт выклікаюць некаторыя прадукты. Паспрабуйце весці «харчовы дзённік», пры дапамозе якога потым можна высветліць, якая менавіта ежа аказвае на малога такі непажаданы ўплыў. Альбо — прасцей — пракансультуйцеся ў алерголага.
- Рэгулярна вадзіце малога да стаматолага і своечасова залечвайце хворыя зубы.
- Правярайце склад зубных пастаў і апалосквальнікаў, якімі карыстаецца дзіця. Ёсць звесткі, што сродкі, якія ўтрымліваюць рэчыва лаўрылсульфат натрыю, павялічваюць рызыку заражэння стаматытам. Магчыма, гэта з-за таго, што яны абязводжваюць слізістую, робячы яе больш далікатнай і адчувальнай да інфекцыі.
- Адвучыце дзіця ад шкодных звычак грызці пазногці і трымаць у роце палец.
- Прывучыце малога з самага ранняга дзяцінства няўхільна захоўваць гігіенічныя правілы: не піць з агульнай бутэлькі або шклянкі, не есці нямытай садавіны ці агародніны, старанна мыць рукі перад ядой.
- І яшчэ адна парада: калі грыбковы стаматыт у дзіцяці прымае пастаянны характар, неабходна, каб члены сям'і, якія даглядаюць яго, абследаваліся ў доктара: можа здарыцца, што хтосьці з іх, сам таго не падазраючы, з'яўляецца крыніцай заражэння.

**Падрыхтавала**
**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Твая бяспека

# САСТРОІМ МАРОЗУ ГРЫМАСУ

**Снежаньскія маразы, якія надышлі быццам бы нечакана, правяраюць ужо людзей на трываласць. Ёсць першыя ахвяры сцюжы. Асабліва бязлітасны холад да выпівак, якім мора па калена што ў спякоту, што ў мароз.**

Паніжаная тэмпература паветра — асноўная прычына абмарожанняў. Але рызыка не зніжаецца нават пры нулі градусаў. Моцны вецер, паніжаная вільготнасць паветра, мокрыя адзенне і абутак значна ўзмацняюць страту цяпла арганізмам.

Часцей за ўсё церпяць адкрытыя ўчасткі цела: нос, вушы, шчокі, падбародак і пальцы рук. Першыя прыкметы абмарожання распазнаюцца не адразу. Узнікае лёгкае пячэнне і паколванне, якое часта не ўспрымаецца ўсур'ёз, паколькі гэтыя сімптомы не прыносяць рэзкага дыскамфорту і хутка знікаюць.

Ружовы румянец на шчоках падчас руху — гэта нармальна. Скура чырванее, паколькі сасуды пашыраюцца і прыток крыві да тканак узмацняецца. А вось калі на змену пачырваненню прыходзіць бледнасць — гэта ўжо яўны сімптом абмарожання. Адразу вызначыць цяжкасць абмарожання дастаткова складана. Бо толькі пасля сагравання ўзнікае боль у вобласці пацярпелых участкаў, з'яўляюцца ацёкі і пухіры на скуры. Чым пазней з'явяцца гэтыя прыкметы, тым большая верагоднасць пашкоджання глыбокіх тканак.

Пры халадовай траўме дарагая кожная хвіліна. Таму як мага хутчэй трэба зайсці ў цёплае памяшканне, каб сагрэць абмарожаныя ўчасткі і аднавіць у іх кровазварот. Катэгарычна забаронена выкарыстоўваць пры гэтым сухое цяпло. Самы просты і эфектыўны спосаб — гэта саграванне ў цёплай вадзе. Мясцовыя ванны робяць пры абмарожанні рук і ног. Першапачатковая тэмпература вады павінна быць 36—37°, потым яе паступова павышаюць да 40°. Улічваючы тое, што ванну трэба прымаць не менш за 30 хвілін, падліваць гарачую ваду давядзецца не раз. Калі пры саграванні з'явіўся боль і пачырванела скура, значыць вы стараліся не дарэмна — кровазварот аднавіўся. Замацаваць поспех дапаможа лёгкі масаж, які можна рабіць непасрэдна ў вадзе. Пачынаць расціранні трэба з кончыкаў пальцаў, паступова рухаючыся ўверх. Пасля ванны накладваюць сагравальныя павязкі з некалькіх слаёў марлі і тоўстага слою ваты, які зверху прыкрываюць цэлафанам. Абмарожаныя пальцы трэба абавязкова перакласці палоскамі бінту. Такімі ж цеплаізаляцыйнымі павязкамі саграваюць вушы, нос і шчокі. Пры лёгкім абмарожанні вынік павінен з'явіцца на працягу першых 10—20 хвілін. Калі ж нічога не мяняецца, выклікайце хуткую дапамогу. Да прыезду ўрачоў не рабіце рэзкіх рухаў канечнасцямі. Руку можна падвесіць з дапамогай хусткі ці шаля, а ногі пажадана пакласці так, каб яны былі крыху апушчаны ўніз.

Пры абмарожанні нельга расціраць скуру, якая пабялела, снегам. Ён не толькі лёгка траўмуе скурны покрыў, але і здольны інфіцыраваць.

КАБ ЗАСЦЕРАГЧЫ СЯБЕ АД ХАЛАДОВАЙ ТРАЎМЫ, ТРЭБА ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ПЭЎНЫХ ПРАВІЛАЎ.

- *На мароз выходзьце ў шматслаёвым адзенні. Праслойкі паветра паміж тканінамі выдатна ўтрымліваюць цяпло. Адмоўцеся ад металічных упрыгажэнняў.*
- Змажце твар і рукі спецыяльным тлустым (а не звычайным увільгатняльным) крэмам. А вось спіртавымі ласьёнамі карыстацца не рэкамендуецца.
- *Перад выхадам на мароз трэба перакусіць лёгкай, але каларыйнай стравай.*
- Калі адчуваеце, што пачынаеце замярзаць, парухайцеся.
- *Не расцірайце твар рукавіцай, толькі сухой далонню. А лепш папрактыкавацца ў грымасніччанні, усміхайцеся, моршчыце нос.*
- Пасля таго, як моцна прамёрзніце, будзьце ўважлівыя, трапіўшы нарэшце ў цёплае месца, у транспарце пастарайцеся сесці, бо часта працэс сагравання суправаджаецца моцнымі хваравітымі адчуваннямі і галавакружэннем аж да страты прытомнасці.
- *Не курыце на марозе. Нават адна цыгарэта выклікае спазм капіляраў канечнасцяў, які працягваецца некалькі гадзін, а гэта пэўны шлях да абмаражэння.*
- Не варта і выпіваць на вуліцы. Алкаголь пашырае сасуды, што павялічвае цеплааддачу і садзейнічае пераахаладжэнню. А вось калі замерзлі і ўжо знаходзіцеся ў цяпле — чарка каньяку не будзе залішняй.

НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА РЭКАМЕНДУЕ:

**Расціраць абмарожаныя месцы цёртай цыбуляй і часнаком.**

**Лячыць абмарожаныя месцы заечым тлушчам.**

**На ноч змазваць пашкоджаную скуру камфарна-іхтыёлавай маззю.**

**Вольга ШАЎКО.**

З нагоды

# Газаправод «Сярэдняя Азія — Кітай». Хто выйграў і хто прайграў

**У мінулы панядзелак у Туркменістане адбылася падзея, якая мае не толькі эканамічнае, але і вельмі важнае геапалітычнае вымярэнне і якая прыцягнула зразумелую ўвагу СМІ розных краін. Тут прайшла цырымонія адкрыцця самага доўгага ў свеце газаправода пад назвай «Сярэдняя Азія — Кітай». Аб значнасці падзеі сведчыць той факт, што ў ёй прымалі ўдзел прэзідэнты чатырох краін — Кітая, Туркменістана, Казахстана і Узбекістана.**

Як адзначае польская газета «Дзеннік газэты правнэй», «Масква пацярпела ад уласнай зброі. Кітай змовіўся з Туркменістанам і пабудаваў гіганцкі трубаправод у абыход Расіі. Дзякуючы гэтаму, Пекін становіцца найважнейшым гульцом у рэгіёне, а былыя рэспублікі СССР атрымліваюць новага партнёра і не знаходзяцца ўжо ў залежнасці ад Масквы».

Па працягласці новаму газаправоду няма роўных у свеце, ён налічвае 7 тыс. кіламетраў, з якіх 1833 км праходзяць праз Туркменістан, Узбекістан і Казахстан, а астатнія 5,5 тыс. кіламетраў праз увесь Кітай. Для параўнання: ямалскі газаправод з Сібіры ў Заходнюю Еўропу, які перасякае Польшчу, разлічаны на 4 тыс. км даўжыні. Аднак ямалская труба будуецца ўжо 15 гадоў, і будаўніцтва яшчэ не завершанае, а на пракладку трубы з Сярэдняй Азіі ў Кітай спатрэбіліся няпоўныя тры гады.

Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў з пафасам выказаўся аб тым, што пабудаваны газаправод абновіць старажытны шаўковы шлях, які служыў калісьці для інтэнсіўнага тавараабмену паміж Азіяй і Еўропай. Лідар Кітая выказаўся больш прадметна: «Мы былі вымушаныя аб'яднаць нашы сілы ў цяжкі для свету перыяд. І я спадзяюся, што дзякуючы гэтым інвестыцыям мы будзем не толькі добрымі суседзямі, але таксама добрасумленнымі партнёрамі». На погляд Ху Цзіньтаа, газаправод з'яўляецца адным з падмуркаў для наладжвання ўзаемнага супрацоўніцтва і кааперацыі паміж Кітаем і Туркменістанам.

Пакуль за 27 месяцаў намаганнямі васьмі тысяч рабочых пабудавана першая частка газаправода. Другая будзе завершана да сярэдзіны 2011 года. Яшчэ сёлета па новым газаправодзе мяркуецца перапампаваць у Кітай 150 млн кубаметраў блакітнага паліва. У наступным годзе ў Паднябесную паступіць ужо 6 млрд кубаметраў, а праз тры гады — 40 млрд кубаметраў, галоўным чынам з туркменскага залежу Паўднёвы Ёлатан. Яго запасы складаюць да14 трыльёнаў кубаметраў газу, гэта адно з пяці найбуйнейшых газавых радовішчаў свету.

Для эканомікі Кітая, якая інтэнсіўна развіваецца, пастаўкі сыравіны з Туркменістана маюць жыццёва важнае значэнне, што выявілася на практыцы ў мінулым лістападзе, калі з-за ранніх маразоў былі абмежаваныя пастаўкі газу для прадпрыемстваў дзеля стварэння зімовых рэзерваў для насельніцтва. З недаборам розных відаў сыравіны, якія калісьці турбавалі Кітай, Пекін ужо спраўляецца, а вось з дэфіцытам газу — пакуль яшчэ не. Замоўленыя Кітаем пастаўкі з Сярэдняй Азіі, адзначае польская «Газета выборча» — гэта чвэрць газу, які Расія экспартуе штогод у Заходнюю Еўропу. І менавіта Расія, падкрэслівае далей газета, «трымала дагэтуль у кулаку багатыя на газ дзяржавы Сярэдняй Азіі, карыстаючыся сеткай экспартных газаправодаў, пабудаваных у часы СССР. Гадамі «Газпрам» раўніва пільнаваў манаполію на газаправоды і змушаў дзяржавы Сярэдняй Азіі танна прадаваць сваю сыравіну, калі яны жадалі штосьці зарабіць на экспарце ў Еўропу». Труба ў Кітай вызваляе Сярэднюю Азію ад гэтай манаполіі, а Пекін атрымаў козыры ў перамовах, якія гадамі вядуцца з Расіяй адносна паставак яе газу.

— Кітай напісаў сапраўдную гісторыю поспеху. Ён здолеў дзейнічаць у Сярэдняй Азіі так, як гэта не атрымалася ні ў якой іншай дзяржавы, — сказала цытаваная агенцтвам АФП Анэта Бор з лонданскага інстытута палітычных даследаванняў «Хэтам хаўз». Аналітыкі не могуць адысці ад здзіўлення, як Пекін з такой лёгкасцю забяспечыў свае інтарэсы ў рэгіёне, дзе дамінавала Расія яшчэ з царскіх часоў.

— Усё большая прысутнасць Кітая ў Сярэдняй Азіі з'яўляецца хутчэй вынікам памылак расійскай знешняй палітыкі, чым следствам непасрэднай стратэгіі Пекіна адносна ангажаванасці ў сумежных дзяржавах, — сцвярджае Сара Міхаэльс з кансалтынгавай фірмы «Оксфард аналітыка», якую цытуе агенцтва Рэйтар. «Газета выборча» нагадвае, як у красавіку рэзкі выбух знішчыў галоўны экспартны газаправод з Туркменістана ў Расію і Ашгабад афіцыйна абвінавацію «Газпрам», які нібы справакаваў гэтую аварыю. Трубу адрамантавалі, але расіяне дагэтуль не аднавілі экспарт туркменскага газу, на чым Ашгабад штомесяц губляе 1 млрд долараў. Міхаіл Карчэмкін, аналітык фірмы East European Gas Analysis, падкрэсліваў, што «Газпрам» скарыстаўся аварыяй газаправода, таму што з-за форс-мажорных акалічнасцяў не павінен быў купляць туркменскі газ па ўзгодненых цэнах, і таму змог павялічыць экспарт сыравіны з уласных залежаў. І адбываецца ўсё гэта падчас крызісу, калі спажыванне газу зменшылася і «Газпром» незадаволены скарачэннем экспарту ўласнага газу.

Тым часам Кітай не скупіцца на грошы і толькі сёлета выдзеліў Туркменістану пазыку ў суме 4 млрд долараў на эксплуатацыю залежаў газу, а казахам — 10 млрд долараў. Пекін з уласнай кішэні выклаў таксама сродкі на газаправод з Сярэдняй Азіі.

Аднак больш за ўсё ад кітайскіх поспехаў, падкрэсліваюць замежныя СМІ, можа страціць Еўропа. ЕС падтрымлівае будаўніцтва трубы «Набукка», па якой прадугледжваецца перапампоўка газу ад Каспійскага мора і з Сярэдняй Азіі. Аднак толькі з мінулага лета ЕС вядзе перамовы аб энергетычным супрацоўніцтве з Ашгабадам. І ў той час, калі ў сталіцах Еўропы толькі дыскутуюць аб пакупках газу ў Азіі, Кітай ужо пампуе для сябе гэтую сыравіну.

**Міхаіл БАЦЯН.**

Падпіска-2010

# СВАЕ ЛЮДЗІ Ў КРАІ АЗЁРАЎ

— Маразы не адбіваюцца на падпісной кампаніі, — расказвае **дырэктар Браслаўскага раённага вузла сувязі Аляксандр СІДАРОВІЧ**. — Для таго, каб колькасць чытачоў не падала, пошта робіць усё магчымае, але праблема ў тым, што падпіска ў асноўным трымаецца на чытачах, якія сябруюць са сваімі выданнямі не адзін год, і добрая частка з іх — людзі сталага веку, а прыцягнуць сучасную моладзь, якой больш даспадобы інтэрнэт, вельмі складана.

Прынамсі, менавіта Браслаўскі раён адзін з самых «дасведчаных»: на 1000 чалавек тут прыпадае 768 падпісчыкаў (!). І, як заўважаюць супрацоўнікі пошты, у нашай газеты склаўся амаль што свой «штат» падпісчыкаў, якія сцвярджаюць, што ніколі не прамяняюць гэта выданне ні на якое іншае. Найбольш нашых прыхільнікаў жыве ў Ахрэмаўцах, Дубраўцы, Казянах, Пагошчы, Зараччы, Відзах, Друйску, Друі, Опліce. Паштальёнам, якія працуюць у гэтых мясцінах, перададзена «фірмовая» экіпіроўка — майкі і кепкі з лагатыпам «Звязды». Вялізны дзякуй гэтым людзям за іх нялёгкую працу — на Браслаўшчыне больш 600 невялікіх населеных пунктаў, і каб дабрацца да кожнага чытача, паштальёнам даводзіцца пераадольваць участкі ў 12—15 кіламетраў. Летам выручае веласіпед, а ўзімку даводзіцца дабірацца пехатою. І пры любым надвор'і, нават у такія маразы, як цяпер, усе выданні павінны быць дастаўленыя да чытачоў да 16 гадзін.

У «Звязды» ёсць свае людзі на пошце: не менш за 30 гадоў бухгалтар Браслаўскага РВПС Раіса Данілава чытае нашу газету. «Сёння рэдка можна пачуць беларускую мову. Людзі пачынаюць яе забываць, нашы дзеці ёй не валодаюць. Нават я размаўляю па-руску, але мне прыемней чытаць родную газету на роднай мове. І шмат хто з чытачоў «Звязды» выбірае яе менавіта з-за мовы, — заўважае жанчына. — Я чытаю газету з пачатку да канца, нам з мужам падабаецца разгадваць красворды, шмат тут карыснага пра сельскую гаспадарку, не трэба шукаць ніякія пастановы, яны друкуюцца ў газеце. Жадаю газеце працвітання, і пабольш чытачоў. Калі іх колькасць будзе павялічвацца, будзе больш людзей, якія любяць родную мову».

У сваю чаргу, мы пажадаем працвітання Браслаўшчыне, азёрнаму краю, дзе ўлетку жыхароў бывае менш, чым турыстаў. Апошнія, дарэчы, прыходзяць у захапленне ад мясцовай прыроды, ад летняга россыпу чарніц, суніц і журавін. І, вядома ж, іх прыемна здзіўляюць мясцовыя жыхары, добразычлівыя і адкрытыя (тут спрадвеку давяраюць людзям, у вёсках амаль няма платоў, межаў паміж надзеламі). А яшчэ на Браслаўшчыне вельмі любяць свой край. Мясцовыя школьнікі сабралі шмат унікальнай краязнаўчай інфармацыі — ад песень, легенд, паданняў да ўспамінаў з часоў Другой сусветнай вайны малалетніх вязняў, людзей, якія жылі ў акупацыі, ветэранаў. Амаль у кожнай школе свой музей, а вучні і настаўнікі могуць праводзіць экскурсіі на найвышэйшым узроўні, таму што да дробязяў ведаюць гісторыю свайго краю. Школьнікі ўдзельнічаюць у раскопках, знаходзяць магілкі невядомых салдат з часоў Першай і Другой сусветных войнаў, збіраюць інфармацыю аб вёсках, якія знікаюць, робяць шыкоўныя навуковыя працы на матэрыяле, сабраным у іх мясцовасці. Так, у Грытунах дзеці знайшлі, раскапалі і апісалі лінію абароны яшчэ часоў Першай сусветнай вайны. У Дрысвятах захаваўся шыкоўны сядзібны парк з унікальнымі раслінамі, якія даследаваныя і апісаныя школьнікамі. У Друі знойдзены Барысаў камень, і школьнікі паспрабавалі расшыфраваць на ім надпісы. Першая школа Браслава сабрала матэрыял аб медсёстрах Вялікай Айчыннай вайны, а настаўнік гісторыі 2-й школы даследаваў паходжанне сучасных і старых назваў горада. Вучні Ахрэмаўскай школы запісалі нават рэцэпты народнай медыцыны ад мясцовых знахараў. І гэта толькі павярхоўны пералік таго, што робіцца ў Браслаўскіх школах для захавання цікавай, багатай гісторыі свайго краю, яго традыцый, культуры.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Паважаюць «Звязду» за... нестандартны падыход

**НА галоўным паштовым аддзяленні Віцебска адбылася прэзентацыя «Звязды». На плошчы ўпершыню паставілі галоўную ёлку вобласці, залілі каток. Цяпер працягваюць манціраваць луна-парк. Наша сустрэча з чытачамі пачалася паралельна з пачаткам рабочага перапынку. У гэты час, як заўсёды, тут было шмат людзей. Сярод іх аказаліся і нашы чытачы.**



— Я люблю «Звязду» за тое, што яна вельмі насычаная па змесце. Журналісты стараюцца знайсці нестандартны падыход да асвятлення тэмаў, — такімі думкамі пра «Звязду» падзяліўся наш чытач з Віцебска **Валерый Мікалаевіч СПАТКАЙ**. Ён зайшоў на пошту аплаціць камунальныя паслугі і нечакана для сабе трапіў у госці да прадстаўнікоў «Звязды» падчас прэзентацыі нашай газеты. — Падабаецца як пішуць Ларыса Цімошык, Вікторыя Целяшук, Валянціна Доўнар, шмат іншых аўтараў. Уладзімір Здановіч аператыўна асвятляе галоўныя міжнародныя спартыўныя падзеі. Вельмі цікава чытаць артыкулы пра тое, як захаваць здароўе. Падабаецца рубрыка пра аграгарадкі, што выходзіць пры падтрымцы МТС. Хочацца, дарэчы, каб людзям старэйшага пакалення больш тлумачылі пра магчымасці аплаты тых жа камунальных паслуг пры дапамозе мабільніка.

Сваімі ўражаннямі ад газеты падзяліўся і **інспектар аддзялення па ідэалагічнай рабоце і кадрах Віцебскага абласнога ўпраўлення «Ахова» Сяргей ПАНІМАШЧАНКА**.

— Сярод супрацоўнікаў «Аховы» нямала падпісчыкаў «Звязды», — кажа ён. — Добра, што ў «Звяздзе» цяпер выходзіць спецыяльная ўкладка, прысвечаная дзейнасці «Аховы». Міліцыянерам — героям артыкулаў прыемна прачытаць пра сябе, паказаць газету сваякам, сябрам. «Звязда» аператыўна піша пра тое, што адбылося ў краіне. У лепшы бок змянілася ўкладка «Чырвоная змена».

Арганізаваць сустрэчу з чытачамі нам вельмі дапамаглі **дырэктар Віцебскага філіяла РУП «Белпошта» Сяргей МАКСАК, начальнік аддзела распаўсюджвання друку Таццяна РУТКІС**, іншыя работнікі пошты. За што мы ім шчыра ўдзячныя.

— У газеты ёсць свой твар, свая адметнасць, — расказвае **начальнік аддзела ідэалагічнай работы Віцебскага гарвыканкама Дзяніс ГЛУТКІН.** — Хочацца, каб у наступным годзе — юбілейным годзе Перамогі — больш расказвалася пра ветэранаў, якіх засталося няшмат.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчыкі могуць выйграць электрафены, пыласосы, тэлевізары, печ ЗВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 студзеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 студзеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 25 сакавіка 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 25 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 25.11.09.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 25.11.09 па 30.03.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1597 ад 23.11.09, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

8 **Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______
(аддзяленне сувязі)

______ **на I кв. або 1–е паўг. 2010 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ______
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!», «РАДАР», «АХОВА», «СВАЯ СПРАВА», «ТВАЕ ПРАВЫ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды

(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!», «РАДАР», «АХОВА», «СВАЯ СПРАВА», «ТВАЕ ПРАВЫ»

Кошт: падпіскі ______ руб.; пераадрасоўкі ______ руб.

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму

Куды

(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 43 (332)

## Слоўнік дачніка

**Вірус** — мікраарганізм, нябачны вокам, узбуджальнік хваробаў.
**Пазакаранёвая падкормка** — апырскванне лістоў раслін растворам, які змяшчае пажыўныя рэчывы.
**Выганка** — паскарэнне росту раслін за кошт стварэння аптымальнага рэжыму тэмпературы (звычайна шляхам яе павышэння).
**Гербіцыд** — хімічны сродак барацьбы з пустазеллем.
**Інсектыцыд** — хімічны сродак барацьбы са шкоднымі насякомымі.
**Гумус** — арганічныя рэчывы глебы, якія згнілі і якія надаюць ёй урадлівасць.
**Дзяленне кораня** — спосаб размнажэння шматгадовых раслін.
**Дзярніна** — верхні слой глебы, густа пранізаны каранямі раслін.
**Дрэнаж** — працэс адводу падземных водаў.
**Кампост** — арганічныя матэрыялы (рэшткі), якія згнілі.
**Міжрадкоўе** — прастора паміж двума суседнімі радкамі.
**Мульча** — слой рыхлага матэрыялу, напрыклад, саломы, торфу.
**Мутант** — расліна, якая адрозніваецца па якой-небудзь генетычнай прыкмеце ад тыповых прадстаўнікоў гатунку.

## Барацьба з мышамі



Мышы не толькі псуюць харчовыя прыпасы, адзенне, абутак, яны яшчэ распаўсюджваюць шмат якія інфекцыйныя хваробы, небяспечныя для чалавека, таму нават іх прысутнасць у памяшканні не толькі непажаданая, але і шкодная. Мышы — носьбіты вірусаў такога захворвання, як гемарагічная ліхаманка, успышкі гэтага захворвання бываюць часцей за ўсё вясной, калі пачынаецца дачны сезон, а мышы ўсю зіму бегалі па дачы, як у сябе дома, і ў дамку і разносілі інфекцыю. Вось чаму, калі вы заўважылі прысутнасць няпрошаных гасцей, адразу трэба ў доме ўсё праветрыць, ператрэсці, прамыць, яшчэ лепш прадэзынфекцыяваць.

Прынады можна прыдумаць самыя розныя, толькі б эфектыўна змагацца з грызунамі. Вось адзін са спосабаў: змяшаць муку і гіпс ці алебастр у роўных частках і насыпаць у талерачку, а побач паставіць яшчэ талерачку з вадой, калі мышы з'ядуць прынаду, ім захочацца піць, яны пацягнуцца да вады, гіпс з вадой застываюць і мышы гінуць.

На садовых участках трэба пад кожнае дрэўца пакласці з восені кавалак абпаленага лямцу, паху якога мышы не пераносяць, таму і дрэвы абмінаюць.

## Лімон у пакоі

*«У мяне дома расце лімон і яму ўжо 6 гадоў. Рос ён добра, цвіў, гэтым летам было два лімончыкі. Але цяпер лісты пачалі жаўцець і ападаць. Паліваю і падкормліваю раз на месяц. Падкажыце, калі ласка, што яшчэ зрабіць, каб ратаваць лімон».*

**Місюля Я.Д.,** *в. Падлессе, Слуцкі раён.*



Шаноўная Яўгенія Дзмітрыеўна, мы крышачку нагадаем, як даглядаць лімоны, на што яны хварэюць, чаму гэта адбываецца, а вы параўнайце, што ў вас не так.

Зімой, калі светлавы дзень кароткі, цытрусавыя дрэвы пажадана ўтрымліваць пры тэмпературы 7—14 градусаў цяпла. Дрэва пры такой тэмпературы «засынае» і не патрабуе добрага асвятлення. Калі дрэва вырошчваюць у цёплым пакоі, з тэмпературай паветра +18—+22 градусы, яго пажадана дадаткова дасвечваць так, каб агульны светлавы дзень складаў 10—12 гадзін у суткі. Лепш за ўсё дасвечваць ртутна-вальфрамавай ці люмінесцэнтнай лямпамі.

Дрэва абавязкова паліваюць угнаеннямі 2-3 разы на месяц. Зімой, калі расліна «спіць», падкормку робяць радзей. Дазіроўка — чатырохлітровы гаршчок з дрэвам паліваюць 1 шклянкай падкормкі.

**1-ы варыянт**

Свежы конскі гной разбаўляюць 1:1 і ставяць на 5—7 дзён брадзіць у закрытым слоіку. Перад палівам жыжку працэджваюць і разводзяць вадой 1:10. Акрамя гэтага, два разы на год расліны паліваюць жалезным купарвасам 3 г на 1 л вады і вельмі слабым, крышку ружовым колерам, растворам марганцоўкі.

**2-і варыянт**

Апошнім часам замест гною пачалі прымяняць мінеральныя ўгнаенні з мікраэлементамі. 2-3 грамы ўгнаенняў разводзяць у 1 літры вады. Універсальнае ўгнаенне «цытрусавая сумесь» мае ў сваім складзе ўсе неабходныя для лімона мікраэлементы. Гэта марганец, бор, цынк, жалеза, калій, азот і інш.

Амаль здаровыя лісты пачынаюць ападаць па наступных прычынах: аслабленне расліны зімой пры слабым асвятленні і высокай тэмпературы паветра; паліў халоднай вадой у вельмі высокім тэмпературным рэжыме; лішак вільгаці ў глебе; парушэнне кіслотна-шчолачнага балансу глебы, калі дрэўца бывае заліта і глеба закісае, тады расліну давядзецца перасаджваць.

Саджанцы лімона, апельсіна і іншых цытрусавых у 1-3-гадовым узросце перасаджваюць кожны год у свежую глебу. Дарослыя расліны раз на 2-3 гады. Лімоны перасаджваюць у любы час года, але лепш за ўсё вясной. Глеба павінна быць пажыўнай і рыхлай. Як варыянт: 2 часткі лугавога дзёрну (лёгкага суглінку), 2 часткі ліставой зямлі, 1 частка перагною і 1 частка буйнога (як грэцкія крупы) пяску. Дрэва будзе менш пладаносіць, калі выкарыстаць агародную зямлю. Можна купіць у краме. Для цытрусавых падыходзіць зямля «Лімон», «Ружа».

Паліваюць цытрусавыя водаправоднай вадой, якая адстаялася ад хлору, пакаёвай тэмпературы. Зімой ваду крыху падаграваюць.

## Абрыкос па-беларуску

*«Нягледзячы на тое, што абрыкос выключна паўднёвая расліна, у нас у Гомельскай вобласці яго развядзеннем займаюцца многія. Раскажыце ўвогуле пра ўласцівасці абрыкоса, якія характэрныя асаблівасці яго вырошчвання ў Беларусі?»*

**З. П. Вараб'ёва,** *в. Чонкі, Гомельская вобласць.*



Абрыкос — старажытная расліна. Ён, як і персік, родам з Кітая. Больш як 2000 гадоў таму ён трапіў у Арменію, адтуль — у Італію і Грэцыю, а потым пасяліўся і ў Еўропе. Цікавасць да гэтай культуры асабліва ўзрасла ў апошнія гады, і ўраджаі здымаюць не толькі ў паўднёвых раёнах Беларусі, але і ў Віцебскай вобласці.

Плады абрыкоса прыемныя на смак, духмяныя, іх ужываюць у свежым, сушаным, кансерваваным выглядзе. Але найбольшую вядомасць ва ўсім свеце яны атрымалі ў выглядзе абрыкоса-сухафрукта пад назвай курага (палавінкі абрыкосаў), урук (абрыкосы з костачкамі) і кайса (абрыкосы без костачак). У пладах абрыкоса ў значнай колькасці назапашваюцца самыя розныя рэчывы, вельмі карысныя для чалавека. Асноўныя лекавыя ўласцівасці абрыкосаў вызначаюцца перш за ўсё высокім утрыманнем калію. Сучасная медыцына рэкамендуе ўжыванне абрыкосаў у якасці лячэбнага сродку пры захворваннях сэрца, асабліва ў стадыі дэкампенсацыі, пры парушэннях сардэчнага рытму, пасля інфаркту. Сушаныя і вяленыя абрыкосы выкарыстоўваюць і ў так званых «магніевых» дыетах, якія з'яўляюцца адным са сродкаў лячэння гіпертанічнай хваробы.

Для жыхароў, якія пражываюць у зоне радыеактыўнага забруджвання, важна ведаць, што ўжыванне ў ежу абрыкоса і прадуктаў яго перапрацоўкі перашкаджаюць засваенню арганізмам радыеактыўных элементаў. Плады абрыкоса валодаюць высокай здольнасцю аднаўляць гемаглабін у крыві. Па ўтрыманні караціну (правітаміна А) абрыкос займае другое месца сярод усіх пладова-ягадных культур. Таму абрыкос уводзяць у харчовы рэжым дзяцей для стымулявання росту. Плады абрыкоса, з'яўляючыся важнай крыніцай антыаксідантаў, падтрымліваюць у арганізме на нізкім узроўні колькасць свабодных радыкалаў, папярэджваючы тым самым утварэнне злаякасных пухлін; тармозяць працэс усмоктвання халестэрыну з ежы ў страўнікава-кішачным тракце.

У Сярэдняй Азіі да абрыкоса ставяцца як да вышэйшага дару Алаха, месцічы ўпэўненыя ў тым, што ён падаўжае маладосць і жыццё. Яшчэ гэты фрукт лічыцца «плодам прыгажосці»: ён амаладжвае скуру і ўмацоўвае валасы. Турэцкія медыкі ў выніку шматгадовых даследаванняў прыйшлі да высновы, што некалькі свежых або сушаных абрыкосаў у дзень неабходны мужчынам як паветра: гэты цуда-плод павышае патэнцыю.

У навуковай і народнай медыцыне таксама шырока выкарыстоўваецца насенне абрыкосаў, абрыкосавы алей. Напрыклад, насенне костачак слівы, вішні, персікаў есці нельга, у іх змяшчаецца яд — сінільная кіслата, а вось насенне абрыкосаў прыносіць карысць. У залежнасці ад гатунку яны бываюць салодкія і горкія. Салодкае насенне абрыкоса па смаку не саступае міндалю. З абрыкосавага насення гатуюць арэхавыя начынкі для карамелі і цукерак. Горкае насенне з-за высокага ўтрымання амігдаміну ў ежу не выкарыстоўваецца. Затое гэта рэчыва павышае супраціўляльнасць арганізма пры прамянёвай хваробе. Аднак калі ў арганізм трапіць вялікая колькасць амігдаміну, пад уздзеяннем ферменту эмульсіну адбываецца ўтварэнне сінільнай кіслаты.

Ва ўсходняй медыцыне сумессю здробненага насення абрыкоса і расліннага алею лечаць гемарой. Дарэчы, усім вядомы актываваны вугаль таксама «абавязаны»... абрыкосу: яго робяць са шкарлупіння костак. І, зразумела, насенне шырока выкарыстоўваецца ў касметалогіі. У народнай медыцыне Азербайджана ўпершыню знайшлі прымяненне абрыкосавай камедзі, яе выкарыстоўваюць як супрацьяддзе пры атручэннях.

Усе гэтыя карысныя ўласцівасці пладоў абрыкоса захоўваюцца і ва ўмовах Беларусі.

У натуральных умовах абрыкос расце ў горных раёнах Кітая і Сярэдняй Азіі, дзе шмат сонечных дзён, а зіма кароткая. Зразумела, у нашых кліматычных умовах абрыкос дастаўляе шмат сур'ёзных праблем: нерэгулярна або слаба пладаносіць, недаўгавечны і інш. Але калі добра ведаць біялагічныя асаблівасці, слабыя месцы гэтай выдатнай расліны і не капіраваць прыёмы агратэхнікі іншых традыцыйных пладовых культур, то абавязкова вы дасягнеце поспеху. Таму спадзяёмся, шаноўная Зінаіда Паўлаўна, вы, а таксама іншыя нашы чытачы, выкарыстаўшы нашы парады, пазбегнуць памылак і атрымаюць добры ўраджай.

Пра капрызы абрыкоса, яго слабасці і асаблівасці вырошчвання чытайце ў найбліжэйшых выпусках рубрыкі.

### У КЛІМАВІЧАХ ТВОРАЦЬ ДАБРО

«Твары дабро» — так назвалі пераднавагодняе дзіцячае свята райвыканкам і раённыя арганізацыі БРСМ і Чырвонага Крыжа, якія выступілі арганізатарамі.

На фестывалі дзеці спявалі, гралі на музычных інструментах, танцавалі, паказвалі тэатральныя кампазіцыі, дэманстравалі малюнкі і мастацкія вырабы. Асаблівая ўвага нададзена творчасці сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды і з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Ул. інф.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

❖ **Оценка оборудования и транспортных средств**
❖ **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**

**Извещает о проведении аукциона по продаже права на заключение договоров аренды торговых мест, принадлежащих ОАО НТК «Алеся», 21 января 2010 г.**

| № лота | Наименование торгового объекта | Цель использования | Местоположение | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с учетом НДС 18 %) | Сумма задатка, бел. руб. (с учетом НДС) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Торговый объект площадью 7,0 м² | Торговля непродовольственными товарами, оказание услуг | Магазин № 16 «Лесной» г. Гомель, ул. Зайцева, 67 | 3 000 000 | 300 000 |
| 2 | Торговый объект площадью 4,0 м² | Торговля непродовольственными товарами, оказание услуг | Магазин № 4 «Алеся» г. Гомель, ул. Ильича, 30 | 1 650 000 | 165 000 |
| **Открытый аукцион состоится в 12.00 21 января 2010 г. в Гомельском областном управлении Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а».** | | | | | |
| 1 | Торговый объект № 10 площадью 5 м² | Торговля зоотоварами | Магазин № 10 «Черниговский» г. Гомель, ул. Ильича, 301 | 2 200 000 | 220 000 |
| 2 | Торговый объект № 23 площадью 5,5 м² | Торговля зоотоварами | Магазин № 23 «Хрустальный» г. Гомель, ул. Ильича, 87 «а» | 2 400 000 | 240 000 |
| 3 | Торговый объект № 17 площадью 3 м² | Организация продаж страховых услуг | Магазин № 17 «Ипуть» г. Гомель, ул. Свердлова, 3 «а» | 1 300 000 | 130 000 |
| **Закрытый аукцион состоится в 11.00 21 января 2010 г. в Гомельском областном управлении Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а».** | | | | | |

**Ставка арендной платы 6 евро/м²**

**Срок аренды 12 месяцев, начиная с 1 февраля 2010 года.**

1. К участию в открытом аукционе допускаются все желающие – индивидуальные предприниматели, юридические лица, в закрытом – физические, юридические лица, индивидуальные предприниматели, перечень которых предоставлен собственником торговых площадей, при условии предоставления следующих документов:

• заявление по установленной форме;

• копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении. Задаток перечисляется на р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНП 102353509;

• юридические лица должны предоставить – оригинал и копии учредительных документов, индивидуальные предприниматели – оригинал и копию свидетельства индивидуального предпринимателя;

1.1 при участии в торгах представителя предоставляются:

- для юридического лица – документ, подтверждающий полномочия представителя на участие в аукционе и подписание необходимых документов, паспорт представителя;

- для индивидуального предпринимателя – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, нотариально заверенную доверенность.

2. После подписания протокола о результатах проведения аукциона с участниками, ставшими победителями, в течение 5 календарных дней будет заключен договор аренды торговых мест. Победитель аукциона не имеет права отчуждать право аренды торгового объекта третьим лицам, а также сдавать торговый объект в субаренду.

3. Денежные средства в счет оплаты за право на заключение договора аренды вносятся в четыре этапа: 1-й до 01.03.2010 – 25 %; 2-й до 01.06.2010 – 25 %; 3-й этап – до 01.08.2010 – 25 %; 4-й этап до 01.10.2010 – 25 %.

4. Документы для участия в торгах принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. Документы принимаются до 20 января 2010 г. включительно.

5. Вознаграждение организатору аукциона 5 % за счет покупателя. Шаг аукционных торгов 5 %.

6. Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская 34 «а».

**Контактные телефоны: (0232) 77 52 78; 77 52 87 (факс).**

Могилевское городское коммунальное унитарное специализированное автопредприятие

объявляет открытый конкурс

**Предмет закупки:**
- мусоровоз с задней загрузкой — 1 единица,
- мусоровоз с боковой загрузкой — 2 единицы.

Предложения принимаются до 16.00 29.01.2010 г. по адресу: 212013, г. Могилев, Гомельское шоссе, 58А.

**Справки по тел/факс: 8 0222 47 97 84, 46 14 07.**

УНП 700226462

